Источник: "Культура" - 2016-12-10




Міжнародны конкурс мастацтваў у рамках праекта "#byfest" у мінскім Палацы дзяцей і моладзі "Золак".



Майстар-клас па ігры на цымбалах падчас свята беларускай культуры ў аграгарадку Мазалава.



Падчас конкурсна-забаўляльнай праграмы "У коле сям'і" ў Палацы мастацтваў Бабруйска.



Маленькія ўдзельнікі мерапрыемства "Няхай заўжды будзе сонейка!" у Мастах.

# Рэкорды Бабруйска, #byfest і неглюбскі арнамент на перніках

**Сёння ў Асіповіцкім раённым гісторыка-краязнаўчым музеі пройдзе навуковая канферэнцыя, прысвечаная вынікам археалагічных даследаванняў гэтага краю. Як паведамляе дырэктар установы Антаніна Сцяпанава, у мерапрыемстве бяруць удзел супрацоўнікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, якія займаліся тут раскопкамі, а таксама — старшыні сельскіх саветаў, краязнаўцы, настаўнікі гісторыі. Адно з пытанняў парадку дня — ахова 99 археалагічных помнікаў.**

Яўген РАГІН

У сённяшнім аглядзе пісьмаў усе рэкорды б'е Палац мастацтваў горада **Бабруйска**. Пра шматгранную дзейнасць гэтай установы ці не адначасова напісалі тры розныя яе супрацоўнікі. І ў кожнага — свая тэма расповеду. Каб усе так!

Дык вось, загадчык культурна-масавага сектара палаца Кацярына Каваленка паведамляе пра конкурсна-забаўляльную праграму "У коле сям'і", што прайшла ў дысказале ўстановы. Культурна-масавы сектар Палаца і аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Адміністрацыі Першамайскага раёна Бабруйска сабраў сямейныя пары з дзецьмі, якія жывуць у інтэрнатах. *"Пераможцы, — піша аўтар, — былі вызначаны ў намінацыях "Мой дом — мая крэпасць", "Творчая майстэрня", "З песняй па жыцці", "Самая інтэлектуальная сям'я", "Пальчыкі абліжаш", "Раніца мудрэйшая за вечар".*

*"У аграгарадках Варатынь і Вязоўніца выступілі лепшыя самадзейныя калектывы нашай установы,* — распавядае метадыст арганізацыйна-метадычнага аддзела Палаца мастацтваў горада Бабруйска Ірына Аўсянікава. — *А творцы-аматары Цэнтра культуры і вольнага часу Ленінскага раёна Бабруйска наведалі з канцэртам аграгарадок Кавалі".*

А вось інфармацыя загадчыка арганізацыйна-метадычнага аддзела палаца Наталлі Чорнай. Яна вядзе гаворку пра семінар па прафілактыцы СНІДу. Прысутныя паглядзелі тэматычны фільм і ўрывак са спектакля, паслухалі лекцыі спецыялістаў. Працавала бібліятэчная выстава.

У рамках культурнага праекта "#byfest" **у сталічным** Палацы дзяцей і моладзі "Золак" прайшоў Міжнародны конкурс мастацтваў. Ён меў тры намінацыі: музыка, вакал, харэаграфія. Было пададзена больш за 230 заявак ад удзельнікаў узростам ад 4 да 18 гадоў і больш сталых з Мінска, Салігорска, Гомеля, Бабруйска, Маладзечна, Слуцка, Барысава, а таксама з гарадоў Польшчы, Украіны, Туркменістана, Кітая, Расіі. Актыўны ўдзел у праекце бралі навучэнцы **Ашмянскай** дзіцячай школы мастацтваў: дуэт "Незабудкі" (настаўнік Тацццяна Чэрская), ансамбль "Пацерачкі" (настаўнік Тацццяна Чэрская), ансамбль гітарыстаў "Фіеста" (настаўнік Алеся Місюкевіч), а таксама — салісты, выхаванцы Тацццяны Печкур, Галіны Крыніцкай, Галіны Нацэўскай. "Незабудкі" ў складзе Марыі Чэрскай і Кацярыны Шыманскай атрымалі дыплом І ступені, а саліст Вадзім Васілеўскі — дыплом ІІІ ступені.

Піша загадчык **Мастоўскай** раённай дзіцячай бібліятэкі Тацццяна Ярашук: *"Наша ўстанова даўно і плённа супрацоўнічае з Цэнтрам карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі горада Масты. Выхаванцы яго — пастаянныя госці ў бібліятэцы і ўдзельнікі нашых мерапрыемстваў. Вось і гэтым разам дзеці-інваліды прыйшлі на свята "Няхай заўжды будзе сонейка!" Разам з бібліятэкарамі, якія выступілі ў ролі адважных каўбояў, яны выправіліся ў займальнае падарожжа. А яно суправаджалася гульнямі, конкурсамі, песнямі і танцамі ў стылі кантры".*

У аграгарадку **Мазалава** прайшло свята беларускай культуры. Вядучы метадыст Віцебскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці Андрэй Струнчанка распавядае, што *"на мерапрыемства завіталі студэнты з Кітая, Лівана, Нігерыі, якія навучаюцца ў Віцебскай ветэрынарнай акадэміі".* Госці не толькі агледзелі Мазалава і не толькі пачаставаліся дранікамі. Пасля канцэрта з удзелам народнага ансамбля народнай песні і музыкі "Вераснянка", тэатральнага гуртка "Вобраз" і выкладчыкаў ДШМ былі наладжаны майстар-класы па ігры на беларускіх народных інструментах. А сельская бібліятэка прапанавала пазнавальную праграму. Андрэй Струнчанка дадае: *"пры мясцовым СДК дзейнічае клуб інтэграцыйнага сяброўства "Згода". Замежныя госці аграгарадка сталі новымі ўдзельнікамі клуба".*

Гарадская бібліятэка № 1 **Барысава** афарміла кніжную выставу "Зімы цудоўныя матывы". У сямі раздзелах прэзентуюцца не проста кнігі на зімовую тэматыку, але і напісаныя так, што абавязкова паспрыяюць стварэнню добрага настрою чытачоў у пераднавагодні час і ў перыяд зімовых школьных вакацый.

7 снежня споўнілася б 75 гадоў з дня нараджэння выбітнага фальклардыста Беларусі Васіля Ліцвінкі. Дзякуючы яго намаганням, паведамляе прэс-служба Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, на філалагічным факультэце БДУ была створана Навукова-даследчая лабараторыя беларускага фальклору і дыялекталогіі. У выніку яе дзейнасці ўзніклі чатыры архівы: рэгіянальны (усіх раёнаў краіны) — больш за чатыры мільёны тэкставых запісаў; жанравы, дзе тыя запісы сістэматызаваныя; аўдыяархіў — каля 500 тысяч музычных запісаў; відэаархіў — 233 фільмы пра самабытныя з'явы абрадава-святочнай культуры ў рэгіянальных варыянтах. Васіль Ліцвінка, як кіраўнік згаданай лабараторыі, выдаў 18 фальклорных зборнікаў, манаграфіі, шматлікія календары, папулярызаваў наш фальклор на радыё і тэлебачанні.

Навіна з маёй роднай **Веткі**. Мясцовы кандытарскі цэх пачаў выпускаць пернікі, аздобленыя выявай часткі арнаменту неглюбскага ручніка. Той рэдкі выпадак, калі брэнд нараджае брэнд. Пернікі "дэбютавалі" на Дні ручніка ў Неглюбцы. Інфармацыя, безумоўна, цікавая для тых, хто яшчэ не вырашыў, пад якімі брэндамі будзе жыць і развівацца ягоны раён... Асабіста я збіраю калекцыю магніцікаў з арнаментальнымі элементамі неглюбскага ручніка. Такімі сувенірамі гандлююць у Веткаўскім музеі стараверства і беларускіх традыцый імя Фёдара Шклярава, а таксама — у **Неглюбскім сельскім цэнтры ткацтва.**

Інфармацыя, што прыйшла з **Лёзненшчыны** (даўно адсюль не было навін). Яна таксама звязана з раённым брэндам. Загадчык аддзела Раённага цэнтра культуры па фальклоры і народных традыцыях Ганна Макравусава паведамляе, што 23 снежня адбудзецца ўручэнне прэміі "Сунічка" па выніках 2016 года. Сунічка — брэнд раёна. Цяпер тую ягадку можна сустрэць не толькі ў мясцовых лясах, але і на шматлікіх вырабах майстроў, што працуюць у раённым цэнтры рамёстваў. А прэмія ўручаецца лепшым работнікам культуры і самадзейным творчым калектывам. Каму гэтым разам — паведамім у наступных нумарах.

Навагоднюю ёлку з футра зрабілі метадысты **Лепельскага** цэнтра рамёстваў "Скарбонка". Пра гэта распавяла кіраўнік установы Ніна Звягінцава. Метровая прыгажуня, аздобленая вышыванымі цацкамі, адпраўляецца на абласны конкурс "Калядная зорка", які ладзіць **Віцебскі** абласны метадычны цэнтр народнай творчасці. А ёлачкі меншых памераў, вязаныя з нітак ці з мішуры, цяпер прадаюцца ў сувенірнай краме, што працуе пры Лепельскім цэнтры рамёстваў.

**Буда-Кашалёўскі** райвыканкам, карцінная галерэя імя Яўсея Майсеенкі, Гомельская абласная ўніверсальная бібліятэка арганізавалі выставу, прысвечаную 100-годдзю з дня нараджэння народнага мастака СССР Яўсея Майсеенкі — ураджэнца гэтага краю. Сёння фонд галерэі складаецца з больш чым 700 экспанатаў, з якіх больш як 100 твораў жывапісу, у тым ліку і эцюд самога майстра 1946 года. У выставе "Спаведзь прасторы" прымаюць удзел члены Беларускага саюза мастакоў Анатоль, Глеб і Тацццяна Отчыкі, Любоў Сцяпанава, Леанід Кір'янаў. К

Яўген Рагін. Рэкорды Бабруйска, #byfest і неглюбскі арнамент на перніках